# ПЕРШАЯ ЎСЕСАЮЗНАЯ

«Памяць — гэта не толькі захаванне мінулага, але і клопаты аб будучым»,— пад такім дэвізам праходзіла ў Палтаве (кастрычнік 1987 г.) Усесаюзная канферэнцыя, у якой удзельнічалі 350 вучоных, спецыялістаў, краязнаўцаў. У праблемным дакладзе акадэміка С. Л. Ціхвінскага, выступленнях вядучых спецыялістаў акадэміка АН УССР П. Ц. Транько, С. О. Шміта, Я. Я. Вадарскага і інш. адзначалася, што развіццё гістарычнага краязнаўства — гэта не толькі распрацоўка тэарэтычных пытанняў, але і абагульненне краязнаўчай практыкі, вопыту, назапашанага ў працэсе краязнаўчай дзейнасці музеямі, бібліятэкамі, навуковымі і вучэбнымі установамі, Таварыствам аховы помнікаў гісторыі і культуры.

Удзельнікі канферэнцыі адзначылі шэраг істотных недахопаў у развіцці гісторыка-краязнаўчых даследаванняў. Яшчэ не заўсёды міністэрствы і ведамствы праяўляюць належную ўвагу да пытанняў гісторыка-краязнаўчай работы. Не лепш у гэтым плане выглядаюць і масавыя грамадскія арганізацыі і творчыя саюзы. Адсутнасць каардынацыі ў гэтым напрамку вядзе да няўзгодненасці ў рабоце, яе дубліравання, не дазваляе арганізаваць паўнацэнную прапаганду ведаў па краязнаўству сярод насельніцтва.

Яшчэ не забяспечаны неабходны ўзровень выкладання гістарычнага краязнаўства ў школах, педагагічных інстытутах, універсітэтах, няма праграм выкладання гэтага курса. Аналагічная сітуацыя склалася і ў падрыхтоўцы вучэбных дапаможнікаў.

Выступаючыя падкрэслівалі, што краязнаўства патрабуе ведаў па гісторыі, мастацтвазнаўству, літаратуры, прыродазнаўству, таму падштурхоўвае пастаянна ўзбагачаць свой культурны ўзровень, ствараць новыя і папаўняць ужо дзеючыя музеі і архівы, сустракацца са спецыялістамі, чытаць навуковую літаратуру. Дыяпазон удзелу ў краязнаўчым руху вельмі шырокі і мае надзвычай вялікае выхаваўчае значэнне.

Вывучэнне гісторыі свайго краю ў яе розных аспектах магчыма пры ўмове выяўлення, аналізу і выкарыстання ўсіх гістарычных крыніц розных тыпаў, родаў і відаў — пісьмовых, рэчыўных, выяўленчых, кіна-, фота- і фонадакументаў. Архіўным установам мэтазгодна актывізаваць работу па падрыхтоўцы і выданню зборнікаў дакументаў па гісторыі гарадоў і сёл, прамысловых і сельскагаспадарчых прадпрыемстваў, помнікаў гісторыі і культуры. Наспеў час прыступіць да сістэматызацыі помнікаў навукі і тэхнікі. Па сутнасці гэта работа пакуль не вядзецца.

На канферэнцыі абмяркоўваліся актуальныя праблемы арганізацыі гісторыка-краязнаўчай работы ў розных рэгіёнах краіны. Так, на Украіне павышэнне цікавасці да краязнаўства ў 60—70-я гады ў многім звязана з выпускам 26-томнага выдання «Гісторыі гарадоў і сёл УССР». У падрыхтоўцы фундаментальнай гістарычнай працы, удастоенай Дзяржаўнай прэміі СССР, прынялі ўдзел каля 100 тысяч чалавек — вучоных, настаўнікаў, работнікаў музеяў і бібліятэк, краязнаўцаў. У Беларусі выдадзены 6 тамоў «Збору помнікаў гісторыі і культуры». Аднак вопыт гэтай работы паказвае, што яшчэ многія гісторыка-культурныя помнікі застаюцца па-за ўвагай даследчыкаў.

За апошнія 20 гадоў у нашай рэспубліцы выдадзена больш як 60 прац, прысвечаных буйным гарадам, раённым цэнтрам і пасёлкам гарадскога тыпу. Усе яны вылучаюцца параўнальна невялікім аб'ёмам, добрай якасцю мастацкага і паліграфічнага афармлення, адзіным прынцыпам рэдагавання і, на жаль, наяўнасцю адных і тых жа недахопаў. Перш за ўсё для іх характэрны павярхоўны падыход да дарэвалюцыйнай гісторыі гарадоў. У некаторых з іх багатае шматвяковае мінулае асвятляецца на некалькіх старонках. Такі від літаратуры павінен характарызавацца не толькі колькаснымі паказчыкамі, а перш за ўсё якасцю. У кнігах па гісторыі населеных пунктаў жыццё гарадоў і сёл павінна быць прадстаўлена ва ўсёй сваёй складанасці і разнастайнасці, з глыбокім і ўсебаковым аналізам.

У нашай рэспубліцы рыхтуецца 6-томнае выданне «Гарады і вёскі Беларусі», дзе будзе расказана пра мінулы і сённяшні дзень краю, яго людзей, якія актыўна ўдзельнічалі ў рэвалюцыйным руху, у абароне сацыялістычнай Айчыны, самаахвярна працуюць сёння. Гэта работа вядзецца пад кіраўніцтвам Інстытута мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору АН БССР і будзе выдадзена Беларускай Савецкай Энцыклапедыяй.

Сярод праблем, якія абмяркоўваліся на канферэнцыі, важнае месца адводзілася гісторыі фабрык і заводаў. Настаў час пісаць навуковыя манаграфіі аб прадпрыемствах, якія дасягнулі вялікіх поспехаў, аб калгасах і саўгасах. Да гэтай работы трэба прыступаць неадкладна, пакуль яшчэ могуць падзяліцца ўспамінамі многія першыя ўдзельнікі сацыялістычных пераўтварэнняў у гаспадарцы рэспублікі. Сёння, калі мы з такой увагай адносімся да развіцця аграрнага сектару эканомікі, выданне прац па гісторыі калгасаў і саўгасаў спрыяла б павышэнню прэстыжнасці сельскіх прафесій, замацаванню маладых кадраў на вёсцы.

У абмеркаванні праблем на канферэнцыі прынялі ўдзел В. І. Мялешка (Гарады Беларусі ў савецкай гісторыка-краязнаўчай літаратуры), А. Г. Каралёва (Беларускія сёлы ў канцы XVIII — пачатку XX ст.), аўтар гэтых радкоў (Вывучэнне гісторыі навуковых устаноў і вну БССР), Я. Н. Мараш (Аб сістэме гісторыка-краязнаўчай падрыхтоўкі студэнтаў), В. С. Касмылёў (Гісторыка-краязнаўчая работа на гістфаку БДУ), А. Л. Кіштымаў (Помнікі навукі і тэхнікі Беларусі), Д. В. Караў (Гістарычнае краязнаўства ў Беларусі ў канцы XIX — пачатку XX ст.). Пры распрацоўцы практычных рэкамендацый былі ўлічаны пажаданні, а таксама вопыт краязнаўчай работы, назапашаны ў Беларусі.

Удзельнікі канферэнцыі абмеркавалі і адобрылі «Асноўныя напрамкі далейшага развіцця гістарычнага краязнаўства ў СССР». Здзяйсненне вызначаных мерапрыемстваў у значнай меры пашырыць пазнаваўчыя і выхаваўчыя магчымасці гістарычнага краязнаўства, зробіць яго магутнай крыніцай камуністычнага выхавання савецкага народа.

**Г. КАРЗЕНКА,**
**кандыдат гістарычных навук.**